ISSN 1993-1999

# БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЧАСОПІС

1993 2018

4
2018




РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

*Аляксандр* **КОРЗЮК**

# СІСТЭМА ГІСТАРЫЧНАЙ АДУКАЦЫІ Ў СЯРЭДНЯЙ ШКОЛЕ Ў СССР І РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ (1934–2018 гг.)

*З часу набыцця Рэспублікай Беларусь назалежнасці для нацыянальнай гістарычнай адукацыі характэрныя разнастайныя змены, у тым ліку рэалізацыя лінейнага і канцэнтрычнага прынцыпаў пабудовы зместу вывучэння айчыннай і сусветнай гісторыі. Што выклікае пераўтварэнні і наколькі вопыт прымянення такіх дыдактычных прынцыпаў у савецкай школе дапасуецца да сучасных задач гістарычнай адукацыі?*

Пры вызначэнні структуры і зместу гістарычнай адукацыі ў сярэдняй школе асноватворным з'яўляецца пытанне аб прынцыпе іх пабудовы — лінейным ці канцэнтрычным. ***Лінейны прынцып*** пабудовы зместу гістарычнай адукацыі прадугледжвае аднаразовае вывучэнне сусветнай і айчыннай гісторыі ў храналагічнай паслядоўнасці. Пры ажыццяўленні дадзенага прынцыпу гістарычны працэс вывучаецца паслядоўна са старажытных часоў да сучаснасці, у выніку чаго ў вучняў павінны фарміравацца веды пра асноўныя тэндэнцыі і заканамернасці развіцця грамадства, стварыцца яркае ўяўленне пра найбольш значныя гістарычныя падзеі і з'явы, выпрацавацца агульнавучэбныя і спецыяльныя гістарычныя ўменні: паслядоўна апісваць гістарычныя падзеі, вылучаць прычынна-выніковыя сувязі, параўноўваць гістарычныя факты, правільна выкарыстоўваць гістарычную тэрміналогію.

Да станоўчых бакоў лінейнай структуры школьнай гістарычнай адукацыі можна аднесці звядзенне да мінімуму дублявання вучэбнага матэрыялу, магчымасць паралельнага вывучэння гісторыі асобных краін, рэгіёнаў у вызначаныя гістарычныя перыяды. Адным з найбольш сур'ёзных яе недахопаў з'яўляецца вывучэнне ранніх і найбольш працяглых перыядаў гісторыі вучнямі малодшага падлеткавага ўзросту (10—13 гадоў). На прычыне ўзроставых псіхалагічных асаблівасцяў гісторыя вучням 5—7 класаў уяўляецца не як дынамічны працэс, а як шэраг статычных з'яў. Пры вывучэнні прадмета выкарыстоўваюцца галоўным чынам эмпірычныя спосабы апрацоўкі вучэбнага матэрыялу, і менавіта таму ў недастатковай ступені рэалізуецца праблемны характар вывучэння гісторыі.

***Канцэнтрычны прынцып*** пабудовы зместу гістарычнай адукацыі прадугледжвае вывучэнне аднаго вучэбнага матэрыялу некалькі разоў з павелічэннем аб'ёму. Дадзены прынцып у навучанні неабходны ў тых выпадках, калі навуковыя паняцці, законы, тэорыі ў сілу ўзроставых асаблівасцяў вучняў не могуць быць засвоены імі адразу ж і ў патрэбным аб'ёме. Пры канцэнтрычнай структуры зместу адукацыі новыя веды фарміруюцца не простым іх далучэннем да ўжо атрыманых, а шляхам новага структуравання ўжо вывучанага матэрыялу. Канцэнтрычная пабудова школь-



***КОРЗЮК Аляксандр Аляксандравіч.***
*Загадчык кафедры ўсеагульнай гісторыі і методыкі выкладання гісторыі БДПУ імя Максіма Танка, кандыдат педагагічных навук, дацэнт. Нарадзіўся ў 1977 г. у Мінску. У 1999 г. закончыў гістарычны факультэт БДПУ імя Максіма Танка. Лаўрэат прэміі Мінгарвыканкама (2001 г.) і прэміі Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных вучняў і студэнтаў "За асабісты ўклад у развіццё здольнасцяў таленавітай моладзі" (2005 г.). Аўтар каля 200 навуковых і метадычных публікацый. Аўтар і суаўтар вучэбна-метадычных дапаможнікаў, кампанентаў электронных вучэбна-метадычных комплексаў і вучэбна-метадычных комплексаў па сусветнай гісторыі і гісторыі Беларусі для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі, у тым ліку 12 дапаможнікаў для настаўнікаў, 5 дапаможнікаў для вучняў, 5 дапаможнікаў для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

най гістарычнай адукацыі дазваляе вяртацца да раней вывучаных тэм і паказваць працэс грамадскага развіцця ў дынаміцы, перайсці ад падзейна-храналагічнага вывучэння гісторыі да праблемна-тэарэтычнага.

Да пераваг канцэнтрычнай структуры можна аднесці магчымасць сістэматызаваць і абагуліць увесь гістарычны матэрыял, увесці ў школьны курс гісторыі асновы метадалагічных ведаў, навучыць вучняў асновам некаторых метадаў гістарычнага даследавання. У якасці магчымага слабага боку канцэнтрычнай структуры гістарычнай адукацыі прызнаецца частковае дубляванне вучэбнага матэрыялу.

**У 1934 г.**, пасля вяртання савецкай школы да класна-ўрочнай сістэмы і прадметнага падыходу да навучання, і па **1959 г.** у выкладанні гісторыі рэалізоўваўся **лінейны прынцып**[1]: 3-4 класы вывучалі элементарны курс гісторыі СССР; 5 клас — гісторыю Старажытнага свету; 6 клас — гісторыю Старажытнага свету (першае паўгоддзе) і Сярэдніх вякоў (другое паўгоддзе); 7 клас — гісторыю Сярэдніх вякоў; 8 клас — Новую гісторыю (ч. I, XVI—XVIII стст. у першым паўгоддзі); гісторыю СССР да канца XVIII ст. у другім паўгоддзі; 9 клас — Новую гісторыю (ч. II, XIX ст.); гісторыю СССР XIX ст., адпаведна ў першым і другім паўгоддзях, 10 клас — гісторыю СССР XX ст.

У прынятай 8 кастрычніка **1959 г.** пастанове ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР "Аб некаторых змяненнях у выкладанні гісторыі ў школах" у мэтах паляпшэння яе выкладання была зроблена спроба ліквідаваць выяўленыя на той час асноўныя недахопы школьнай сістэмы гістарычнай адукацыі, якая дзейнічала без істотных змен з 1934 г. Да іх, у прыватнасці, былі аднесены недастатковая эфектыўнасць вывучэння элементарнага курса гісторыі СССР у малодшых класах, перагружанасць фактычным матэрыялам сістэматычных курсаў гісторыі Старажытнага свету і Сярэдніх вякоў для вучняў 5—7 класаў; занадта вялікая ўдзельная вага гэтых курсаў у параўнанні з курсам Новай і адсутнасць курса па Найноўшай гісторыі; няведанне выпускнікамі няпоўнай сярэдняй школы важнейшых падзей з Найноўшай гісторыі замежных краін; недастатковая падрыхтоўка вучняў гэтай школы па гісторыі СССР[2]. Пастановай вызначаўся наступны парадак вывучэння прадмета[3]: у 4 класе — эпізадычныя апавяданні з гісторыі СССР; у 5 класе — элементарны курс гісторыі Старажытнага свету; у 6 класе — элементарны курс гісторыі Сярэдніх вякоў; у 7—8 класах — элементарны курс гісторыі СССР з важнейшымі звесткамі аб грамадскім і дзяржаўным ладзе Савецкай дзяржавы, а таксама звесткамі з Новай і Найноўшай гісторыі замежных краін; у 9—11 класах — сістэматычныя курсы па гісторыі СССР, Новай і Найноўшай гісторыі замежных краін.

У васьмігадовай (няпоўнай) школе курсы гісторыі вызначаліся як элементарныя, а ў сярэдняй школе (дзесяцігадовай) — як сістэматычныя. Як бачна з пастановы, вывучэнне сусветнай гісторыі (старажытнай, сярэднявечнай, новай і найноўшай) грунтавалася, як і раней, у асноўным на базе **лінейнага прынцыпу** пабудовы зместу вучэбнага матэрыялу. У аснову вывучэння гісторыі СССР быў пакладзены **канцэнтрычны прынцып** пабудовы зместу курса: спачатку вывучаліся эпізадычныя апавяданні, потым элементарны курс і пасля — курс сістэматычны. У якасці абгрунтавання неабходнасці пераходу да канцэнтрызму вядомыя савецкія дыдакты гісторыі І.Я.Лернер і А.Ц.Кінкулькін адзначалі, што такі прынцып пабудовы зместу вучэбнага матэрыялу даваў магчымасць паглыбленага засваення айчыннай гісторыі, а таксама больш "эканомнага", чым раней, вывучэння дакапіталістычнага перыяду гісторыі СССР у процівагу падрабязнаму вывучэнню важнейшых фактаў з гісторыі савецкага грамадства і Камуністычнай партыі. Акрамя гэтага, на іх думку, прынцып канцэнтрызму дазваляў фарміраваць разуменне заканамернасцяў гістарычнага развіцця і спрыяў больш глыбокаму і трываламу засваенню ведаў[4].

Акрамя вышэйпералічаных мерапрыемстваў ЦК Кампартый і Саветам Міністраў саюзных рэспублік пастановай 1959 г. даручалася разгледзець пытанне аб вывучэнні ў школах гісторыі сваёй саюзнай рэспублікі. Гэта было выклікана тым, што адным з важных недахопаў існуючай на той час школьнай сістэмы гістарычнай адукацыі з'яўлялася недастатковая падрыхтоўка вучняў па гісторыі СССР, асабліва па гісторыі саюзных рэспублік. Міністэрствам асветы БССР было вырашана не ўводзіць асобны вучэбны прадмет, а ўключыць урокі і некаторыя пытанні па гісторыі Беларусі ў адпаведныя раздзелы і тэмы праграмы па гісторыі СССР у 7—11 класах. Для гэтага ў адпаведныя тэмы праграмы па гісторыі СССР былі ўключаныя 30 тэм і 32 пытанні па гісторыі БССР. Пры гэтым дадатковы час на іх вывучэнне не вылучаўся, а падручнік па гісторыі БССР служыў дапаўненнем да падручнікаў па гісторыі СССР. Вывучэнне гісторыі БССР было накіравана не на выхаванне нацыянальнай самасвядомасці вучняў, а на фарміраванне ў іх марксісцка-ленінскага светапогляду, савецкага патрыятызму і інтэрнацыяналізму, што адпавядала партыйным і дзяржаўным установкам. Тым не менш уключэнне айчыннай гісторыі ў праграму сярэдняй школы мела станоўчае значэнне і стварала патэнцыяльныя магчымасці для азнаямлення вучняў з галоўнымі фактамі па гісторыі беларускага народа.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Аднак да 1965 г. педагагічнай грамадскасці стала зразумелым, што змены, унесеныя ў структуру і змест школьнай гістарычнай адукацыі, былі не да канца прадуманымі. Па прычыне дублявання вучэбнага матэрыялу, асабліва пры пераходзе да дзесяцігадовай сярэдняй адукацыі, канцэнтрычная сістэма навучання гісторыі не апраўдала сябе. Істотнае павелічэнне колькасці гадзін на вывучэнне гісторыі не прывяло да павышэння якасці гістарычнай адукацыі вучняў. У сувязі з гэтым 14 мая **1965 г.** была выдадзена новая пастанова ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР "Аб змяненні парадку выкладання гісторыі ў школах". Парадак вывучэння гісторыі ў 4—6 класах застаўся тым жа, але курсы гісторыі Старажытнага свету і Сярэдніх вякоў перасталі называцца элементарнымі. Замест элементарнага курса гісторыі СССР у 7—8 класах і сістэматычнага ў 9—11 класах гісторыя СССР вывучалася адзін раз, паслядоўна з 7 па 10 клас, а Новую і Найноўшую гісторыю прадугледжвалася вывучаць у 8—10 класах паралельна з гісторыяй СССР[5]. У якасці зыходных пазіцый для распрацоўкі новых праграм і падручнікаў былі ўзятыя **лінейны прынцып** пабудовы школьнай гістарычнай адукацыі і **сінхроннасць** выкладання айчыннай і сусветнай гісторыі.

Такім чынам, было прынята рашэнне вярнуцца да лінейнай пабудовы зместу курсаў гісторыі СССР, якая прадугледжвала аднаразовае паслядоўнае вывучэнне гістарычнага працэсу са старажытных часоў да сучаснасці. Аднак, на думку выдатнага савецкага метадыста Ф.П. Кароўкіна, пераход да лінейнага прынцыпу навучання гісторыі не азначаў простага вяртання да структуры і зместу гістарычнай адукацыі 1940—50-х гг. Як і ў 1959 г., у змесце вучэбнага гістарычнага матэрыялу яшчэ больш павялічылася колькасць тэм па гісторыі XIX — першай палове XX ст.

У выніку з **1965 г.** склалася наступная структура вывучэння гісторыі, якая праіснавала да 1992/1993 навучальнага года, калі ў краінах, якія ўтварыліся пасля распаду СССР, пачалі дзейнічаць нацыянальныя сістэмы школьнай гістарычнай адукацыі: 4 клас — эпізадычныя апавяданні па гісторыі СССР; 5 клас — гісторыя Старажытнага свету; 6 клас — гісторыя Сярэдніх вякоў; 7 клас — гісторыя СССР са старажытных часоў да канца XVIII ст.; 8 клас — Новая гісторыя (1640—1871 гг.), айчынная гісторыя (гісторыя СССР) XIX ст.; 9 клас — Новая гісторыя (1871—1917 гг.), гісторыя СССР з пачатку XX ст. да канца 1930-х гг., Найноўшая гісторыя з канца 1930-х гг.; 10 клас — гісторыя СССР з 1939 гг.; Найноўшая гісторыя з 1939 гг.

Такім чынам, у савецкай школе лінейны прынцып навучання гісторыі рэалізоўваўся з 1934 па 1959 і з 1965 па 1993 гг., а спроба пераходу да канцэнтрычнай структуры школьнай гістарычнай адукацыі была прадпрынятая ў 1959—1965 гг.

У аснову пабудовы зместу гістарычнай адукацыі ў сярэдняй школе Рэспублікі Беларусь з **1992/1993** навучальнага года быў пакладзены **прынцып канцэнтрызму**, што прадугледжвалася прынятай у канцы 1991 г. Канцэпцыяй гістарычнай адукацыі ў сярэдняй школе Беларусі[7]. У рэчышчы дэмакратычных пераўтварэнняў у аснову зместу школьнай гістарычнай адукацыі было прапанавана пакласці прынцыпы дэпартызацыі і дэідэалагізацыі, якія павінны былі рэалізоўвацца праз адмову ад ідэалагічных штампаў і догмаў марксісцка-ленінскай метадалогіі. Вызначальным прынцыпам адбору зместу гістарычнай адукацыі абвяшчаліся гуманізацыя і плюралізм, заснаваныя на творчым асэнсаванні і засваенні розных канцэпцый сусветна-гістарычнага працэсу. Найбольш аптымальным варыянтам пабудовы школьных курсаў гісторыі было прызнана спалучэнне цывілізацыйнага і фармацыйнага падыходаў. Пры вызначэнні структуры і зместу прадмета прапаноўвалася кіравацца прынцыпамі адзінства айчыннай і сусветнай гісторыі і шматварыянтнасці вучэбных праграм і падручнікаў. На вывучэнне айчыннай гісторыі ў школе прапаноўвалася адвесці не менш за 1/3 ад усяго часу, прызначанага для вывучэння прадмета. Упершыню гісторыя Беларусі стала вывучацца ў якасці асобнага вучэбнага прадмета і асэнсоўвацца з дзяржаўных пазіцый.

Канцэпцыя пачала рэалізоўвацца ў 1992/1993 навучальным годзе. У сціслыя тэрміны навукоўцы і метадысты падрыхтавалі першыя варыянты вучэбных праграм па гісторыі; вучэбны матэрыял выходзіў у перыядычным друку напярэдадні правядзення адпаведных урокаў, бо новых падручнікаў не было, а старыя не адпавядалі новаму зместу гістарычнай адукацыі і таму не маглі выкарыстоўвацца ў адукацыйным працэсе. Ключавым момантам у працэсе станаўлення нацыянальнай сістэмы школьнай гістарычнай адукацыі стала з'яўленне першых вучэбных дапаможнікаў, якія адпавядалі новаму зместу гістарычнай адукацыі і сацыяльна-палітычным рэаліям.

У апошнім, 4, класе пачатковай школы ўводзіўся вучэбны прадмет "Мая Радзіма — Беларусь", які меў прапедэўтычны характар, быў арыентаваны на фарміраванне ў вучняў уяўленняў і элементарных першапачатковых ведаў аб найбольш значных падзеях айчыннай гісторыі, выконваў функцыю падрыхтоўкі школьнікаў да сістэматычнага вывучэння гісторыі. У 5—9 класах гісторыя вывучалася на эмпірычным (падзейна-храналагічным) узроўні, заснаваным на вывучэнні і засваенні факталагічнага матэрыялу і яго першапачатковым абагульненні; у 10—11 класах — на праблемна-тэарэтычным, на якім павінны былі закладвацца асновы тэарэтычнага асэнсавання вучнямі заканамернасцяў і асаблівасцяў сусветна-гістарычнага працэсу.



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

*Табліца 1*

**Структура школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь у 1992—2008 гг.**

| Клас | 11-гадовая школа | 12-гадовая школа |
|---|---|---|
| 5 | Гісторыя Старажытнага свету; Гісторыя Беларусі старажытных часоў | Гісторыя Старажытнага свету; Гісторыя Беларусі старажытных часоў |
| 6 | Гісторыя Сярэдніх вякоў; Гісторыя Беларусі ў сярэднія вякі | Гісторыя Сярэдніх вякоў; Гісторыя Беларусі ў сярэднія вякі |
| 7 | Сусветная гісторыя Новага часу (XVI—XVIII стст.); Гісторыя Беларусі Новага часу (XVI—XVIII стст.) | Сусветная гісторыя Новага часу (XVI—XVIII стст.); Гісторыя Беларусі Новага часу (XVI—XVIII стст.) |
| 8 | Сусветная гісторыя Новага часу (XIX — пачатак XX ст.); Гісторыя Беларусі Новага часу (канец XVIII ст. — 1917 г.) | Сусветная гісторыя Новага часу (XIX — пачатак XX ст.); Гісторыя Беларусі Новага часу (канец XVIII ст. 1917 г.) |
| 9 | Сусветная гісторыя Найноўшага часу; Гісторыя Беларусі Найноўшага часу | Сусветная гісторыя Найноўшага часу (1918—1945 гг.); Гісторыя Беларусі Найноўшага часу (1917—1945 гг.) |
| 10 | Сусветная гісторыя ад старажытных часоў да канца XVIII ст.; Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да канца XVIII ст. | Сусветная гісторыя Найноўшага часу (з 1945 года); Гісторыя Беларусі Найноўшага часу (з 1945 года) |
| 11 | Сусветная гісторыя (XIX—XX стст.); Гісторыя Беларусі (канец XVIII — XX ст.) | Сусветная гісторыя ад старажытных часоў да канца XVIII ст.; Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да канца XVIII ст. |
| 12 | | Сусветная гісторыя (XIX—XX стст.); Гісторыя Беларусі (канец XVIII — XX ст.) |

**У 1998 г.** у Рэспубліцы Беларусь пачалося правядзенне школьнай рэформы, якая прадугледжвала пераход з 11-гадовага на 12-гадовы тэрмін навучання. Павелічэнне планаванага тэрміну навучання выклікала змены ў структуры школьнай гістарычнай адукацыі, аднак яго канцэнтрычная пабудова засталася нязменнай *(гл. табліцу 1)*.

**З 2008/2009** вучэбнага года адбылося вяртанне да 11-гадовага навучання. Пры пераглядзе і абнаўленні зместу адукацыі з 5 па 11 клас у пабудове зместу вучэбных прадметаў стаў дамінаваць лінейны падыход. Зыходзячы з гэтага, новай Канцэпцыяй вучэбнага прадмета "Сусветная гісторыя. Гісторыя Беларусі" прадугледжваўся пераход ад канцэнтрычнага да **лінейнага прынцыпу** пабудовы зместу вучэбных праграм[8]. У поўным аб'ёме ён завяршыўся ў 2012/2013 навучальным годзе. Пры гэтым засваенне зместу гістарычнай адукацыі ў 5—9 класах ажыццяўлялася на падзейна-храналагічным, а ў 10—11 — на падзейна-храналагічным і праблемна-тэарэтычным узроўнях:

5 клас — гісторыя Старажытнага свету: да V ст. н. э.

6 клас — гісторыя Сярэдніх вякоў: V—XIII стст.; гісторыя Беларусі: са старажытных часоў да сярэдзіны XIII ст.

7 клас — гісторыя Сярэдніх вякоў: XIV—XV стст.; гісторыя Беларусі: другая палова XIII першая палова XVI ст.

8 клас — сусветная гісторыя Новага часу: XVI—XVIII стст.; гісторыя Беларусі: другая палова XVI — XVIII ст.

9 клас — сусветная гісторыя Новага часу: канец XVIII — пачатак XX ст.; гісторыя Беларусі: канец XVIII — пачатак XX ст.

10 клас — сусветная гісторыя Найноўшага часу: 1918—1945 гг.; гісторыя Беларусі: 1917—1945 гг.

11 клас — сусветная гісторыя Найноўшага часу: другая палова 1940-х гг. — пачатак XXI ст.; гісторыя Беларусі: другая палова 1940-х гг. — пачатак XXI ст.

Можна заўважыць, што вывучэнне гісторыі Беларусі ва ўмовах лінейнай пабудовы зместу адукацыі ажыццяўлялася на аснове іншай перыядызацыі, чым раней. У яе аснову было пакладзена не спалучэнне фармацыйнага і цывілізацыйнага падыходаў, а знаходжанне тэрыторыі Беларусі ў складзе адпаведных нацыянальна-дзяржаўных утварэнняў.

**З 2015/2016** навучальнага года ў нашай краіне ў сувязі з рашэннем аб адноснай завершанасці агульнай сярэдняй адукацыі на II ступені, вяртаннем профільнага навучання на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі і пераходам да навучання на аснове кампетэнтнаснага падыходу было вырашана вярнуцца да **канцэнтрычнай пабудовы** зместу гістарычнай адукацыі *(гл. табліцу 2)*.

Пры гэтым парадак вывучэння (паслядоўнае ці паралельнае вывучэнне) вучэбных прадметаў "Гісторыя Беларусі" і "Сусветная гісторыя" ва ўсіх класах (на базавым і павышаным узроўнях) настаўнік вызначае па сваім меркаванні. Плануецца, што пераход да канцэнтрыч-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Табліца 2*

**Структура школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь з 2015/2016 навучальнага года**

| Клас | Сусветная гісторыя | Гісторыя Беларусі |
|---|---|---|
| **5** | Гісторыя Старажытнага свету (са старажытных часоў да V ст. н. э.) | |
| **6** | Гісторыя Сярэдніх вякоў (V—XV стст.) | Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да канца XV ст. |
| **7** | Сусветная гісторыя Новага часу (XVI—XVIII стст.) | Гісторыя Беларусі (XVI—XVIII стст.) |
| **8** | Сусветная гісторыя Новага часу (XIX — пачатак XX ст.) | Гісторыя Беларусі (XIX — пачатак XX ст.) |
| **9** | Сусветная гісторыя Найноўшага часу (1918 — пачатак XXI ст.) | Гісторыя Беларусі Найноўшага часу (1917 — пачатак XXI ст.) |
| **10** | Сусветная гісторыя ад старажытных часоў да канца XVIII ст. | Гісторыя Беларусі ад старажытных часоў да канца XVIII ст. |
| **11** | Сусветная гісторыя: XIX — пачатак XXI ст. | Гісторыя Беларусі: XIX — пачатак XXI ст. |

най мадэлі цалкам завершыцца ў 2021/2022 навучальным годзе.

**З 2015/2016** навучальнага года для ўзмацнення практыкаарыентаванай накіраванасці адукацыі вывучэнне гісторыі ў нашай рэспубліцы ажыццяўляецца на аснове ***кампетэнтнаснага падыходу***. У навучанні гісторыі ён прадугледжвае арыентацыю не на механічнае запамінанне пэўнага аб'ёму інфармацыі — дат, паняццяў, асоб, падзей і г. д., а на фарміраванне ў вучняў вопыту самастойнага рашэння задач на аснове атрыманых ведаў пра сацыякультурнае і гістарычнае развіццё грамадства і ўласнага сацыяльнага вопыту. Пры гэтым *кампетэнцыі* характарызуюцца як асобасныя якасці, якія фарміруюцца ў адукацыйным працэсе ў ходзе засваення вучнямі ведаў, набыцця ўменняў, навыкаў, вопыту дзейнасці, неабходных для ўдасканалення атрыманай адукацыі або набыцця новай, працоўнай дзейнасці, паспяховай сацыялізацыі ў грамадстве.

Зыходзячы з гэтага, сфарміраваная ў рамках навучання гісторыі кампетэнтнасць вучняў прадугледжвае магчымасць выяўлення сувязі мінулага з сучаснасцю; здольнасць знаходзіць вытокі сучасных з'яў у мінулым; разуменне абумоўленасці і ўзаемасувязі сацыяльна-эканамічных і грамадска-палітычных працэсаў у мінулым і сучаснасці; уменне выкарыстоўваць ужо засвоеную інфармацыю ў паўсядзённай жыццядзейнасці і ўключаць новую інфармацыю ў пэўны кантэкст. Асобасныя, метапрадметныя і прадметныя кампетэнцыі вучняў могуць быць паспяхова сфарміраваныя ва ўмовах пошуку і выбару, якія патрабуюць пэўнай самастойнасці школьнікаў па арганізацыі сваёй вучэбна-пазнавальнай дзейнасці. Таму настаўнік павінен імкнуцца да таго, каб у працэсе вывучэння гістарычнага матэрыялу кожны вучань меў магчымасць самастойна набываць веды, прымяняць іх на практыцы і авалодваць неабходнымі для гэтага спосабамі дзейнасці.

Такім чынам, праведзены кароткі агляд развіцця школьнай гістарычнай адукацыі паказаў, што на працягу другой паловы XX — пачатку XXI ст. яе змест у пэўныя перыяды будаваўся на аснове як лінейнага, так і канцэнтрычнага прынцыпаў. Змены ў прынцыпах пабудовы зместу гістарычнай адукацыі былі выкліканыя пошукамі аптымальнай мадэлі яго развіцця і адпавядалі тым мэтам, якія сталі перад сістэмай сярэдняй адукацыі ў пэўны гістарычны перыяд. Нягледзячы на тое, што і лінейная, і канцэнтрычная структура гістарычнай адукацыі могуць спрыяць рэалізацыі мэтаў гістарычнай адукацыі, дыскусія аб ступені іх эфектыўнасці ва ўмовах кампетэнтнаснага падыходу да навучання прадмета яшчэ не завершана.

[1] Багдановіч І.І. Методыка выкладання гісторыі ў школе: вучэб. дапам. Мінск, 2009. С. 37; Студеникин М.Т. Методика преподавания истории в школе: учеб. для студ. высш. учеб. заведений. Москва, 2003. С. 29.

[2] Бущик Л.П. Очерк развития школьного исторического образования в СССР. Москва, 1961.

[3] О некоторых изменениях в преподавании истории в школах: постановление ЦК КПСС и Совета Министров СССР, 8 октября 1959 г. // Народное образование в СССР: общеобразовательная школа: сб. док-тов: 1917—1973 гг. Москва, 1974. С. 196-197.

[4] Кинкулькин А.Т., Лернер И.Я. Новый этап в развитии школьного исторического образования // Вопросы истории. 1961. № 7. С. 6—20.

[5] Об изменении порядка преподавания истории в школах: постановление ЦК КПСС и Совета Министров СССР, 14 мая 1965 г. // Народное образование в СССР: общеобразовательная школа: сб. док-тов: 1917—1973 гг. Москва, 1974. С. 218-219.

[6] Коровкин Ф.П. Развитие школьного исторического образования в СССР за 50 лет // Преподавание истории в школе. 1967. № 6. С. 33—55.

[7] Канцэпцыя гістарычнай адукацыі ў сярэдняй школе Беларусі // Настаўніцкая газета. 1991. 30 лістапада. С. 2-3.

[8] Концепция учебного предмета "Всемирная история. История Беларуси" // Беларускі гістарычны часопіс. 2009. № 6. С. 14.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ